М. П. ГАЙБА

# НАВАГРУДАК

## ГАДЫ І ПАДЗЕІ

М. П. ГАЙБА

# НАВАГРУДАК
# гады і падзеі

Навагрудак—1995 г.

**Выданне ажыццёўлена на сродкі**

**вытворча-камерцыйнага прадпрыемства**

# МЕРКОМ

**231400 г. Навагрудак, вул. А. Міцкевіча, 9**
**тэл.: (01597) 2-06-73, 2-34-83**

ГАЙБА Мікалай Паўлавіч.
Навагрудак: гады і падзеі.—Навагрудак, 1995.—23 с.

Кожны маленькі гарадок
Да вялікае кнігі падобны,
**В. ІПАТАВА**

Заснаваны на мяжы X—XI стст. г. Навагрудак упісаў шмат адметных старонак у гісторыю беларускай дзяржавы, у гісторыю Польшчы, Літвы і Расіі. У розныя стагоддзі быў розным яго адміністрацыйны статус і яго роля у дзяржаўным жыцці, але Навагрудак заўжды выяўляў сваю адметнасць.

У брашуры ў форме невялікіх гістарычных даведак даецца характарыстыка звязаных з г. Навагрудкам адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў: княства, ваяводства, павета. Упершыню зроблена спроба падаць гісторыю горада ў храналагічнай паслядоўнасці найважнейшых фактаў і падзей, што адбываліся тут з часу яго ўзнікнення і да пачатку ўстанаўлення савецкай улады ў 1939 г. Сабраныя разам звесткі здольны даць пэўнае ўяўленне пра яго палітычную і ваенную гісторыю, эканоміку, адукацыю, культуру, царкоўнае жыццё. Далейшае вывучэнне гісторыі дазволіць зрабіць гэты спіс больш поўным і рознабаковым.

Дадзенае выданне разлічана на настаўнікаў і вучняў школ, краязнаўцаў, на ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй свайго краю.

Выказваю падзяку калегам па працы — супрацоўнікам Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея Т. Вяршыцкай, Т. Ішуцінай, А. Снітко за карысныя парады і заўвагі пры падрыхтоўцы брашуры і дырэктару ВКФ «Мерком» Ю. Гацкаму за фінансаванне выдання.

# Навагрудскае княства

Утварылася ў XII ст. з цэнтрам у г. Навагрудку.

Пад 1228 г. упамінаюцца «новогордці», якія разам з тураўцамі, пінянамі і куранамі абложылі Камянец. У сярэдзіне 1230-х гадоў княства належала Ізяславу, які разам з Літвой хадзіў паходам на Конрада Мазавецкага. У 1240-х гадах княства перайшло да Міндоўга, які каранаваўся ў г. Навагруску на караля Літвы. На сярэдзіну XIII ст. летапісныя звесткі гавораць ужо аб існаванні значна большай чым княства тэрыторыі — Навагародскай зямлі. Яна становіцца аб'ектам шматлікіх ваенных паходаў галіцка-валынскіх князёў (1248-49, 1251, 1252, 1274, 1278 гг.). Пасля Міндоўга г. Навагрудкам і княствам папераменна валодалі Раман Данілавіч Галіцкі, сын Міндоўга Войшалк, Шварн Данілавіч Галіцкі. У другой палове XIII—пачатку XIV ст. горад стаў рэзідэнцыяй вялікіх князёў літоўскіх. У гэты перыяд на тэрыторыю княства нападалі мангола-татары (1258, 1274, 1278 гг.), крыжакі (1252, 1314 гг.). Пасля пераносу сталіцы ВКЛ у Вільню, Навагрудскае княства перайшло да сына вялікага князя літоўскага Гедыміна Карыята, затым—да сына Карыята Фёдара. Пазней Навагрудскае княства было ўдзелам сыноў вялікага князя Літоўскага Кейстута Войдата, за ім—Таўцівіла. У канцы XIV ст. належала Карыбут Дзмітрыю.

У 1394 г. Навагрудак быў залічаны да вялікакняжацкіх уладанняў, і ім сталі кіраваць намеснікі вялікага князя. Навагрудскае княства, такім чынам, страціла сваю аўтаномію.

# Навагрудскі перыяд гісторыі Вялікага княства Літоўскага

Працягваўся ў другой палове XIII—пачатку XIV стст.. У гэты час г. Навагрудак стаў ядром утварэння і сталіцай Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).

Станаўленне дзяржавы праходзіла ў перыяд паходаў крыжакоў на літоўскія і мангола-татар на паўднёварускія землі. Навагрудская зямля к сярэдзіне XIII ст. была найбольш бяспечным рэгіёнам, а г. Навагрудак меў высокі ўзровень эканамічнага развіцця і выйшаў з-пад уплыву галіцка-валынскіх князёў. З 1246 г. князем Навагрудка са згоды мясцовых жыхароў стаў літоўскі князь — перабежчык Міндоўг. У бліжэйшыя пяць гадоў ён падпарадкаваў літоўскія землі і паклаў пачатак утварэння новай двуэтнічнай дзяржавы. Аднак супраць панямонскіх княстваў, што прынялі ўладу Міндоўга, выступілі ваеннымі паходамі Галіцка-Валынскае княства ў кааліцыі з Лівонскім Ордэнам. Каб вывесці з гульні крыжакоў, Міндоўг зрабіў вымушаны крок—згадзіўся на ўвядзенне каталіцтва, фактычна адмовіўся ад сваіх правоў на Жмудзь, і пры падтрымцы Ордэнскага магістра з благаславення рымскага папы быў каранаваны 6 ліпеня 1252 г. у г. Навагрудку на караля. І ўсё ж утрымаць г. Навагрудак яму не ўдалося. У 1254 г. паводле мірнага дагавору паміж сынам Міндоўга Войшалкам і Данілам Галіцкім, г. Навагрудак стаў уладаннем сына Данілы Рамана. Дзяржава Міндоўга распалася прыкладна па тых жа швах, па якіх стваралася: Навагрудчына, Літва, Жмудзь.

Праз чатыры гады Войшалк адваяваў у Рамана Навагрудчыну і, стаўшы навагрудскім князем, праз некаторы час падпарадкаваў Літву, Нальшаны, Дзяволтву і практычна стварыў тое ядро, да якога пазней былі далучаны іншыя землі, што ўтварылі Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае.

У наступныя дзесяцігоддзі XIII ст. новая дзяржава здолела адстаяць сваю незалежнасць, адбіўшы чарговыя паходы на яе галіцка-валынскіх князёў, мангола-татар і крыжакоў.

З 1293 г. навагрудскі герб «Пагоня» стаў знакам вялікага князя і гербам Вялікага княства Літоўскага. З 1323 г. сталіцай дзяржавы стаў г. Вільня.

# Навагрудскае ваяводства

Утворана ў студзені 1507 г. з цэнтрам у г. Навагрудку. Падзялялася на тры паветы: Ваўкавыскі, Навагрудскі, Слонімскі. У Навагрудскі павет на правах асобнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ўваходзіла Слуцкае княства, якое ў 1791 г. было ператворана ў Случарэцкі павет з цэнтрам у Слуцку. Агульная плошча Навагрудскага ваяводства складала 36920 кв. км., а насельніцтва ў сярэдзіне XVII ст.—375000 чалавек (62400 дамоў). Навагрудскімі ваяводамі былі: Іван Глінскі, Ольбрахт Гаштольд, Ян Забжэзінскі, Станіслаў Гаштольд, Грыгорый Остык, Аляксандр Хадкевіч, Аляксандр Палубінскі, Іван Гарнастай, Павел Сапега, Мікалай Радзівіл, Фёдар Тышкевіч, Мікалай Сапега, Аляксандр Слушка, Зыгмунд Радзівіл, Томаш Сапега, Ежы Храптовіч, Крыштаф Халецкі, Пётр Вяжэвіч, Крыштаф Валадковіч, Ян Керсноўскі, Дзімітрый Палубінскі, Багуслаў Уняхоўскі, Стэфан Тызенгаўзен, Мікалай Радзівіл, Ян Радзівіл, Ежы Радзівіл, Іосіф Ябланоўскі, Іосіф Несялоўскі. Ваяводы кантралiравалі крыніцы вялікакняжацкіх і дзяржаўных даходаў, арганізоўвалі ўзброеныя сілы ў ваяводстве, ажыццяўлялі судовыя функцыі ў замкавым судзе. Карысталіся значнай незалежнасцю ад цэнтральных дзяржаўных органаў.

На тэрыторыі Навагрудскага ваяводства 10 гарадоў і мястэчкаў мелі Магдэбургскае права: Ваўкавыск, Капыль, Клецк, Любча, Мір, Навагрудак, Нясвіж, Ружаны, Слонім, Слуцк.

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1773 г.) Случарэцкі павет і ўсходняя частка Навагрудскага павета ўвайшлі ў Мінскую губерню Расійскай імперыі. У 1793 г. у складзе Навагрудскага ваяводства створаны Сталавіцкі павет з цэнтрам у в. Сталавічы. Ваўкавыскі павет адыйшоў да Гродзенскага ваяводства.

Паводле трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Навагрудскае ваяводства ўвайшло ў склад Расіі і ўключана ў Слонімскую губерню.

З 1921 па 1939 год існавала ў складзе Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Утворана згодна закона ад 4.02.1921 г. аб унарміраванні прававога і палітычнага стану на землях Рэчы Паспалітай. Падзялялася на восем паветаў: Баранавіцкі, Валожынскі, Лідскі, Навагрудскі, Нясвіжскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі, Шчучынскі (з 1929 г.) Плошча ваяводства складала 22966 кв. км., насельніцтва —822106 чалавек у 1921 г., 1057220 чалавек у 1931 г. Па нацыянальнаму складу, згодна перапісу 1921, палякі складалі 54%, беларусы—37,8%, праваслаўныя—51,2%, рымакатолікі—34,9%. Ваяводамі Навагрудскага ваяводства былі: В. Рачкевіч, У. Янушайціс, З. Бечковіч, В. Костэк-Бернадскі.
Пасля ўз'яднання ў час другой сусветнай вайны (1939 г.) Заходняй Беларусі з БССР на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства была ўтворана Баранавіцкая вобласць.

# Навагрудскі павет

Існаваў у 1507—1940 гг. у складзе Вялікага княства Літоўскага, Расійскай імперыі, Польшчы.

У часы ВКЛ знаходзіўся ў складзе Навагрудскага ваяводства. Тэрыторыя павета часова была занята рускімі войскамі ў 1534 г. і ў 1655—1660 гг., рускімі і шведскімі ў 1706 і 1709 гг. У антыфеадальную вайну 1648—1651 гг. тут адбыліся масавыя сялянскія выступленні. У пач. 70-х гг. 18 ст. на тэрыторыі павета былі разбіты атрады пры-

хільнікаў Барскай канфедэрацыі.

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) усходняя частка Навагрудскага павета ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Па трэцяму падзелу Рэчы Паспалітай (1795 г.) тэрыторыя павета была далучана да Расіі і ўключана ў склад Слонімскай губерні. З 1797 г.—у Літоўскай, з 1802 г.—Гродзенскай, з 1843 г.—у Мінскай губерні.

Плошча павета складала 97,6 кв. міляў, або 457,7 тыс. дзесяцін, з якіх 276 тыс. дзесяцін займалі палі. Насельніцтва ў 1861 г.—135 435 чал. (самы густанаселены павет Мінскай губерні). Па веравызнанню праваслаўных было 71%, католікаў 23,58%, іудзеяў 4,98%, магаметан 0,43%. Па сацыяльнаму складу: сельскіх саслоўяў 83,7%, гараджан 7,3% ваенных 4,4%, дваран 4,4%, духоўных асоб 0,4%. Павет складаўся з 23 валасцей, 5 паліцэйскіх станаў. У 1866 г. у павеце працавала 57 фабрык і заводаў (34 вінакурныя, 15 цагляных, 5 скіпідарных, 3 піваварныя). У 1900 г. было 19 фабрык і заводаў з агульнай колькасцю 276 рабочых. Асноўным гандлёвым шляхам у павеце была р. Нёман (8 прыстаняў). Сельскагаспадарчыя прадукты і хатнюю жывёлу адпраўлялі ў Варшаву, Прусію, Вільню, Рыгу і інш. месцы. У 1891 г. у павеце было 29 царкоўнапрыходскіх школ, 170 школ граматы, 33 народныя вучылішчы.

У вайну 1812 г. павет быў заняты французскімі войскамі. У канцы чэрвеня адбылася бітва пад Мірам паміж казакамі атамана Платава і польскімі уланамі ген. Ражнецкага.

У час паўстання 1831 г. на Наваагрудчыне дзейнічаў паўстанцкі атрад колькасцю да 200 чал. на чале з Ю. Кашыцам і М. Межэеўскім. Пасля падаўлення паўстання да адказнасці было прыцягнута 63 чалавекі.

У 1863 г. у павеце створана рэвалюцыйная арганізацыя. Начальнікам павета быў прызначаны К. Кашыц, камісарам У. Борзабагаты, які з-за бяздзейнасці К. Кашыца фактычна стаў яе кіраўніком.

У павеце дзейнічалі атрады У. Борзабагатага, А. Пуслоўскага, Шалевіча, Лашкевіча і інш. Каля в. Мілавіды ад-

былася адна з асноўных бітваў паўстанцаў з царскімі войскамі.

У час рэвалюцыі 1905—1907 гг. у павеце прайшлі масавыя выступленні сялян.

Са жніўня 1915 г. па люты 1918 г. заходняя частка павета разам з г. Навагрудкам акупіравана нямецкімі войскамі. Цераз павет праходзіла т. зв. «лінія Гіндэнбурга». На усх. частцы павету ў лістападзе была ўстаноўлена Савецкая ўлада. 3 лютага 1918 г. тэрыторыя павета поўнасцю акупіравана нямецкай арміяй. Па ўмовах Брэсцкага міру 1918 г. Навагрудскі павет адыходзіў да Расіі, з'яўляўся прыгранічным. Савецкая ўлада была ўстаноўлена ў канцы снежня 1918 г. Дзейнічаў павятовы рэўком на чале з А. Залескім. У пачатку лютага 1919 г. адбыўся павятовы з'езд Саветаў, на якім выбраны выканком з 17 чалавек з красавіка 1919 па ліпень 1920 г. павет акупіраваны польскай арміяй. У ліпені 1920 г. адноўлена Савецкая ўлада. Дзейнічаў павятовы рэўком. Старшыня — Лагіновіч, пазней С. А. Мертэнс. 3 кастрычніка 1920 г. ізноў заняты польскай арміяй.

У 1921—1939 гг. знаходзіўся ў складзе Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Тэрыторыя—2787 км, 12 гмін насельніцтва—109 820 чал. Беларусаў—58,8%, палякаў — 35,4%, яўрэяў—5,5%. Дзейнічалі прадпрыемствы па перапрацоўцы мясцовай сыравіны і прадуктаў сельскай гаспадаркі. Найбольш буйнае прадпрыемства шклозавод «Нёман». 91,3% насельніцтва жыло ў вёсцы. Налічвалася 846 гаспадарак асаднікаў (1933 г.). У пошуках заробку з павета выехала ў краіны зах. Еўропы і Амерыкі ў 1926—1929 гг. 5,53 тыс. чалавек. Адной са значных акцый пратэсту было Асташынскае выступленне сялян 1932 г. Дзейнічала акруговая ўправа ТБШ (да 1929 г.), акруговы камітэт КПЗБ, мясцовыя арганізацыі БСРГ (да 15 тыс. чал.) і іншыя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі.

У чэрвені 1938 г. распараджэннем міністра ўнутраных спраў у пагранічную зону з БССР былі ўключаны Люб-

чанская, Карэліцкая, Пачапаўская, Райцаўская, Цырынская, Шчорсаўская гміны Навагрудскага павета. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР у снежні 1939 г. Навагрудскі павет уключаны ў Баранавіцкую вобласць. У студзені 1940 г. быў скасаваны, а на яго тэрыторыі ўтвораны раёны.

# Храналогія гісторыі г. Навагрудка

| | |
|---|---|
| канец X ст.— | пачатак засялення тэрыторыі сучаснага Навагрудка |
| пач. XI ст.— | узнікненне паселішча на Замкавай гары |
| сярэдзіна XI ст.— | паселішча на Замкавай гары абнесена валам і ператварылася ў гарадскую крэпасць |
| 1044 г.— | першыя звесткі пра г. Навагрудак |
| 1117 г.— | паход мінскага князя Глеба Усяславіча на Навагрудскую (Навагародскую) зямлю |
| пач. XII ст.— | гарадскі пасад (Малы замак) абносіцца валам і ператвараецца ў вакольны горад |
| XII ст.— | заснаванне Барысаглебскай царквы |
| 1246 г.— | хрышчэнне ў Навагрудку Міндоўга і прыняцце ім праваслаўя |
| сярэдзіна XIII ст.— | пачатак будаўніцтва Навагрудскага мураванага замка |
| 1251—1252 г.— | Паход галіцка-валынскіх князёў на Наваградак. |
| 1252 г. (1253) ліпень | Карананыя ў Навагрудку вялікага князя Міндоўга на караля Літвы. |
| 1252 г.— | Нападзенне на Навагрудак крыжакоў. |
| 1254 г.— | Падпісанне Войшалкам, сынам Міндоўга міра з галіцка-валынскім князем Данілам. |

| | |
|---|---|
| 1254—1258 гг.— | Навагрудкам валодаў Раман Данілавіч Галіцкі. |
| 1258 г.— | Нападзенне на Навагрудак мангола-татар. |
| 1258 г.— | Войшалк і полацкі князь Тауцівіл выганяюць з Наваградка Рамана Галіцкага. |
| канец 50-х г.— | Будаўніцтва Лаўрышаўскага манастыра. |
| 1262 г.— | Дагавор паміж князем Міндоўгам і Ноўгарадскім князем А. Неўскім аб сумеснай барацьбе супраць Лівонскага Ордэна. |
| 1263 г.— | Забойства Міндоўга. |
| 1263 г.— | Княжанне ў Вялікім княстве Тройната. |
| 1264—1267 гг.— | Княжанне ў Навагрудку і ВКЛ Войшалка. |
| 1268—1270 г.г.— | Княжанне ў Навагрудку і ВКЛ Шварна Данілавіча. |
| 1270—1282 гг.— | Княжанне ў Навагрудку ВКЛ Трайдэна. |
| каля 1270 г. | Знак «Пагоня» упершыню зафіксаваны як герб г. Навагрудка. |
| 1274 г.— | Няўдалая аблога Навагрудка аб'яднаным войскам Галіцка-Валынскага княства і мангола-татарамі. |
| 1278 г.— | Нападзенне на Навагрудак мангола-татар. |
| 1293—1316 гг.— | Княжанне ў Навагрудку і ВКЛ Віценя. |
| 1293 г.— | Навагрудскі герб «Пагоня» стаў знакам вялікага князя і гербам Вялікага княства Літоўскага. |

**XIV ст.**

| | |
|---|---|
| 1314 г.— | Няўдалы штурм Навагрудка крыжакамі на чале з магістрам Генрыхам фон Плоцке. Іх разгром дружынай гродзенскага кашталяна Давыда. |
| 1317 г.— | Устанаўленне Канстанцінопальскім патрыярхам самастойнай Навагрудска-Літоўскай мітраполіі Першы мітрапаліт Феафіл. |

| | |
|---|---|
| пач. XIV ст.— | Будаўніцтва Замкавай царквы. |
| 1321 г.— | Паход крыжакоў на Навагрудчыну. |
| 1323 г.— | Вялікі князь Гедымін перанёс сталіцу дзяржавы ў Вільню. |
| 1341 г.— | Чарговы крыжацкі паход на Навагрудчыну. |
| 1341 г.— | Навагрудкам, як удзельным княствам, пачынае валодаць Карыят Гедымінавіч. |
| 1358 г.— | Наваградак пераходзіць ва ўладанне яго сына Фёдара. |
| канец XIV ст.— | Наваградак належаў Карыбут Дзмітрыю, пазней—Таўцівілу Кейстутавічу. |
| 1391 г.— | Безпаспяховая аблога Навагрудка крыжацкім войскам магістра Конрада Валенрода. |
| 1394 г.— | Няўдалы штурм Наваградка крыжакамі на чале з магістрам Конрадам фон Юнінгемам і маршалам Вэрнерам Тэцынгерам. |
| 1394 г.— | Навагрудак становіцца адным з цэнтраў вялікакняскага дамена. |
| 1395 г.— | Заснаванне вял. князем Вітаўтам Фарнага касцёла. |
| 1408 г.— | Тайная сустрэча ў Навагрудку вялікага князя Вітаўта і караля Польшчы Ягайлы для абмеркавання падрыхтоўкі рашаючай бітвы з крыжакамі. |
| 1410 г.— | Удзел навагрудскай дружыны ў разгроме крыжакоў пад Грунвальдам. |
| 1415 г.— | У Навагрудку адбыўся сабор праваслаўных епіскапаў, на якім быў выбраны незалежны ад Масквы мітрапаліт. Ім стаў Грыгорый Цамблак. Навагрудак становіцца рэзідэнцыяй праваслаўнага мітрапаліта. |

| | |
|---|---|
| 1422 г.— | Вянчанне ў Навагрудскім Фарным касцёле караля Польшчы Ягайлы з Соф'яй Гальшанскай. |
| 1428 г.— | Грамата вялікага князя Вітаўта, аб перадачы Навагрудка ў пажыццёвае ўладанне жонцы Юльяне. |
| 1444 г.— | Грамата вялікага князя Аляксандра Ягелончынка Навагрудку на няпоўнае самакіраванне. |
| 1448 г.— | У Навагрудку прайшоў сейм Вялікага княства Літоўскага. |
| 1484 г.— | Першы ўспамін аб яўрэях у Навагрудку. |

**XVI ст.**

| | |
|---|---|
| 1505—1506 гг.— | Няўдалыя аблогі Навагрудка войскам мангола-татар султана Біці-Гірэя. |
| 1507, студзень— | Утварэнне Навагрудскага ваяводства з Навагрудскім, Ваўкавыскім і Слонімскім паветамі. Першым ваяводаў стаў Іван Глінскі. |
| 1508 г.— | У Навагрудку адбыўся сейм Вялікага княства Літоўскага. |
| 1511, 26 ліпеня— | Атрыманне Навагрудкам права на самакіраванне — Магдэбургскага права. |
| 1512 г.— | Стварэнне «Навагрудскага Пралога»— беларускага рукапіснага помніка. |
| 1519 г.— | Пабудова ў Навагрудку Барысаглебскай царквы на сродкі кн. Канстанціна Астрожскага. |
| 1525 г.— | Прывілеем вялікага князя новыя жыхары Навагрудка на некалькі гадоў вызваляліся ад падаткаў. |
| 1535 г.— | У час руска-літоўскай вайны Навагрудак часова заняты рускімі войскамі. |
| 1538 г.— | У Навагрудку адбыўся сейм Вялікага княства Літоўскага. |
| 1539 г.— | Адкрыццё ў Навагрудку першай у ВКЛ гімназіі. |
| 1562, 22 студзеня— | Пацвярджэнне Навагрудку прывілея на Магдэбургскае права. |

| | |
|---|---|
| 1563 г. 30 верасня— | Указ вялікага князя Жыгімонта Аўгуста аб перасяленні навагрудскіх яўрэяў за межы замка. |
| 1568 г.— | У Навагрудку налічвалася 10 праваслаўных цэркваў. |
| 1595 г.— | У раёне Навагрудка дзейнічалі казацкія атрады С. Налівайкі. |
| 1581 г.— | З гэтага года Навагрудак стаў месцам правядзення сесій Галоўнага Літоўскага Трыбунала — вышэйшага апеляцыйнага суда Вялікага княства Літоўскага. |
| 1595 г.— | Прывілеем Жыгімонта III Навагрудку было пацверджана Магдэбургскае права. Гораду быў нададзены герб з вывявай Архангела Міхаіла. |
| 1596 г.— | Пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі Навагрудак стаў рэзідэнцыяй уніяцкіх мітрапалітаў ВКЛ. |
| 1597 г. сакавік— | Грамата Жыгімонта III аб дазволе правядзення ў Навагрудку двух штогадовых кірмашоў — «Троіцкага» і «Крещенского». |
| 1597 г.— | Грамаата Жыгімонта III аб дазволе пабудаваць у Навагрудку цагельню і паліць вапну. |
| 1598 г.— | Грамата Жыгімонта III аб дазволе ваграудскаму ваяводзе збіраць з гараджан па 50 залатых для брукавання вуліц горада. |

## XVII ст.

| | |
|---|---|
| 1613 г.— | Прывілеем вялікага князя замкавыя мяшчане Навагрудка падводзіліся пад Магдэбургскае права. |
| 1613 г.— | Уніяцкім мітрапалітам стаў Ян Вельямін Руцкі, ураджэнец в. Рутка пад г. Навагрудкам. |
| 1613 г., сакавік— | Прывілей вялікага князя з дазволам адкрыць у Навагрудку і іншых гарадах бызыліянскія школы з навучаннем на роднай мове. |

| | |
|---|---|
| 1613 г.— | Вялікі пажар у Навагрудку, які знішчыў шмат дамоў і культавых пабудоў. |
| 1616 г.— | Пры Базыліянскім манастыры Навагрудка была адчынена школа. |
| 1617 г.— | З'езд уніяцкага духавенства ў Руце пад Навагрудкам, на якім было аформлена стварэнне Базыліянскага Ордэна. |
| 1618 г.— | У Навагрудку быў зачынены кальвінісцкі храм. |
| 1623 г.— | Яўрэі Навагрудка былі ўключаны пад уладу Брэсцкага кагала. |
| 1624 г.— | На сродкі віленскага ваяводы Хрысціяна Хадкевіча заснаваны ў Навагрудку касцёл Дамініканцаў. |
| 1624 г.— | Пры Барысаглебскай царкве заснаваны бызыліянскі жаночы манастыр. |
| 1626 г.— | У Навагрудку адкрыта езуіцкая місія. |
| 1628 г.— | Пры Барысаглебскай царкве заснаваны базыліянскі мужчынскі манастыр. |
| першая чв. XVII ст.— | Барысаглебская царква перабудавана ва уніяцкі храм. |
| 1631 г.— | Езуіцкая місія пераўтворана ў рэзідэнцыю. |
| 1633 г.— | Грамата вялікага князя і караля Уладзіслава аб вяртанні ў гарадах, у т. л. і ў Навагрудку праваслаўным ад уніятаў па адной царкве. |
| 1635 г.— | Грамата Уладзіслава з адменай рашэння 1633 г. аб вяртанні праваслаўным царквы. |
| 1643 г.— | Устаноўка ў капліцы Фарнага касцёла Я. Дусяцкім памятнай дошкі аб Хоцімскай бітве 1621 г. |
| 1644 г.— | Адкрыццё пры езуіцкім касцёле граматычнай школы. |
| 1649 г.— | Заснаванне на сродкі падканцлера Вялікага княства Літоўскага Казіміра Сапегі кляштара баніфратаў. |
| 1652 г.— | Пажар у г. Навагрудку. |

1652 г.— Першае ўпамінанне ў дакументах аб Навагрудскай ратушы.

1655 г.— У час вайны паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай быў захоплены Навагрудак атрадамі Залатарэнкі і Хаванскага і ўтрымліваўся імі да 1660 г.

1661 г.— Сейм Рэчы Паспалітай, улічваючы бядотнае становішча навагрудчан, пасля вайны, вызваліў Навагрудак ад уплаты ўсіх павіннасцей тэрмінам на 4 гады.

1664 г.— Пераабсталяванне пад ратушу аднаго з будынкаў на гарадской плошчы.

1673 г.— Да гэтага года ў Навагрудку дзейнічаў культ цудатворных каталіцкіх ікон. Цудатворныя іконы мелі ў Навагрудку дамініканцы і езуіты.

1684 г.— У Навагрудку выдадзена кніга аб цудатворных іконах.

др. пал. XVII ст.— Замкавая Успенская царква пераабсталявана пад касцёл.

## XVIII ст.

1702 г.— На сродкі М. Вішнявецкага пабудаваны мураваны езуіцкі касцёл.

1706 г.— У час Паўночнай вайны (1700—1721 гг.) шведамі ўзарваны рэшткі Навагрудскага замка.

1708 г.— Эпідэмія ў Навагрудку, падчас якой загінула амаль палова жыхароў.

1714 г.— Пры езуіцкім касцёле адкрыта школа (калегія).

1719—1723 гг.— Будаўніцтва ў стылі сталага барока Фарнага касцёла.

1751 г.— Паўстанне гараджан, якія адмовіліся падпарадкоўвацца ўладзе ваяводы.

1751 г., 8 мая— Пажар, які знішчыў 167 будынкаў, ратушу, канцылярыю ваяводы, 4 касцёлы.

| | |
|---|---|
| 1756 г.— | Аднаўленне пасля пажару езуіцкага касцёла. |
| 1759 г.— | У г. Львове Іосіфам Пазоўскім выдадзена на лацінскай мове манаграфія пра Навагрудак. |
| 1774 г.— | Езуіцкая аптэка ператворана ў гарадскую. |
| 1775 г.— | Перанос пасяджэння Літоўскага Трыбунала з Навагрудка ў Гродна. |
| 1776 г.— | Пацвярджэнне Варшаўскім сеймам Рэчы Паспалітай Магдэбургскага права Навагрудку. |
| 1780 г.— | Будаўніцтва касцёла францысканцаў. |
| 1784, 23 верасня— | Наведванне горада каралём РП Станіславам Аўгустам Панятоўскім. |
| 1794 г.— | Дзейнасць на тэрыторыі Навагрудчыны паўстанцкіх атрадаў Т. Касцюшкі. |
| 1795 г.— | Трэці падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога Навагрудак быў уключаны ў склад Расійскай імперыі. |
| 1799 г., 12 лютага— | Хрышчэнне ў Фарным касцёле Адама Міцкевіча. |
| 1797—1834— | Дзейнасць Дамініканскай школы. |

**XIX ст.**

| | |
|---|---|
| 1802 г.— | Дазвол гродзенскага губернатара Бенігсена на разбор рэшткаў Замкавых вежаў для брукавання вуліц горада. |
| 1802 г.— | Уключэнне Навагрудка ў склад Гродзенскай губ. |
| 1805 г.— | Высвячэнне Дамініканскага касцёла пад імем святога Міхаіла. |
| 1807—1825 гг.— | Вучоба ў Дамініканскай школе А. Міцкевіча. |
| 1809 г.— | Першы горадабудаўнічы план Навагрудка (не ажыццёўлены). |
| 1810 г.— | Пажар, у якім згарэла Мікалаеўская царква і быў пашкоджаны Дамініканскі касцёл. |
| 1812 г.— | У цэнтры горада пабудаваны драўляныя гандлёвыя рады. |

| | |
|---|---|
| 1812 г., 21.06.— 26.06. | Адыход праз Навагрудак 2-й рускай арміі І. Баграціёна. Уступленне ў горад польскіх часцей Ю. Панятоўскага. |
| 1812 г., 15.08.— | Урачыстасці ў Навагрудку з нагоды дня нараджэння Напалеона Банапарта. |
| 1817—1821 гг.— | Дзейнасць у Навагрудку масонскай ложы «Вузел адзінства». |
| 1823—1824 гг.— | Рамонт будынка гарадской Ратушы. |
| 1825 г.— | У горадзе 3.7 тыс. жыхароў, 15 мураваных і 399 драўляных будынкаў. |
| 1831 г.— | Пажар, які пашкодзіў шэраг жылых будынкаў і Дамініканскі касцёл. |
| 1831 г., 22.07— | Уваход у Навагрудак паўстанцкага атрада Ю. Кашыца і М. Межэеўскага. |
| 1830-я гг.— | На гарадской плошчы пабудаваны мураваныя гандлёвыя рады. |
| 1835 г.— | Разбураны езуіцкі касцёл. |
| 1839 г.— | Ліквідацыя дзейнасці ўніяцкай царквы. |
| 1840 г.— | Закрыты жаночы уніяцкі манастыр пры Барысаглебскай царкве. |
| 1842 г.— | Чарговы праектны план г. Навагрудка. |
| 1843 г.— | Навагрудак уключаны ў склад Мінскай губерні. |
| 1844 г.— | Ліквідавана кагальная арганізацыя яўрэяў. |
| 1845 г.— | Зацверджаны новы герб горада (зменены дэталі ў выяве Архангела Міхаіла). |
| 1846 г.— | Пасля скасавання Ордэна францысканцаў іх касцёл пераўтвораны ў прыходскую Мікалаеўскую царкву. |
| 1850 г.— | Закрыты кляштар дамініканаў. |
| 1851 г.— | Пажар, які знішчыў шэраг будынкаў па Гродзенскай вул., у тым ліку значна пашкодзіў Мікалаеўскую царкву. |
| 1854 г.— | У горадзе 23 мураваныя і 415 драўляных будынкаў, 91 крама, цагельня, піваварня. |
| 1855 г.— | У г. Навагрудку пабудавана драўляная мячэць. |

| | |
|---|---|
| 1857 г.— | Закрыты з-за дрэннага стану Фарны касцёл. |
| 1858—1864, 1866—1868 гг.— | Працавала сямікласная гімназія. |
| 1861 г.— | У г. Навагрудку—6,3 тыс. жыхароў. |
| 1861 г.— | Першы прыезд у Навагрудак сына А. Міцкевіча Уладзіслава. |
| 1862 г.— | Пажар, у выніку якога быў значна пашкоджаны былы дом Міцкевічаў. |
| 1862 г.— | Заснавана фабрыка кафлі братоў Лейтнекераў. |
| 1862 г.— | Стварэнне падпольнай паўстанцкай арганізацыі на чале з У. Борзабагатым. |
| 1863 г., 7.04— | Бой паўстанцкага атрада з царскімі войскамі ля в. Налібакі. |
| 1864 г., лета— | Выкрыта Навагрудская паўстанцкая арганізацыя. |
| 1864 г.— | Закрыты манастыр дамініканак. |
| 1872 г.— | Складзены план рэканструкцыі г. Навагрудка. |
| 1875 г.— | Пасля рамонту, у выніку якога быў значна зменены знешні выгляд, аднавіла дзейнасць Барысаглебская царква. |
| 1870-я гг.— | Разбурана навагрудская Ратуша. |
| 1881 г.— | Пажар, у выніку якога згарэла шмат вайсковых магазінаў і 18 жылых будынкаў, у т. л. дом Міцкевічаў. |
| 1880-я гг.— | Дзейнасць у горадзе і на тэрыторыі павету марксісцкага гуртка І. Трусевіча (Залескага). |
| 1887 г.— | Створана сельскагаспадарчае ашчаднае таварыства. |
| 1888 г.— | Адкрыты банк. |
| 1889 г.— | Заснавана табачная фабрыка. |
| 1895—1913 гг.— | Дзейнічала друкарня Гаркаві. |
| 1897 г.— | Заснаваны завод спіртаачысткі. |
| 1898 г.— | Пачатак дзейнасці тыпалітаграфіі Данцыга. |
| 1899 г.— | Пачатак дзейнасці ў Навагрудку сіяністцкага гуртка. |

| | |
|---|---|
| каля 1900 г.— | Разбураны касцёл дамініканак. |

**XX ст.**

| | |
|---|---|
| 1903 г.— | У касцёле св. Міхаіла стараннем дачкі А. Міцкевіча М. Гарэцкай устаноўлена мемарыьяльная дошка да 100-годдзя паэта. |
| 1905 г.— | На вуліцах горада з'явіліся першыя ліхтары. |
| 1906 г.— | Абвалілася частка Касцёльнай вежы. |
| 1907 г., 15.08— | Пачатак работ па кансервацыі вежаў Замка. |
| 1908 г.— | Пажар, які знішчыў больш за 100 будынкаў. |
| 1909—1912 гг.— | У горадзе адкрыта 6 крэдытных Таварыстваў. |
| 1911 г.— | У г. Навагрудку 251 гандлёвая кропка. |
| 1913 г.— | Пачатак дзейнасці друкарні Гінзбурга. |
| 1914 г.— | Створаны «Камітэт па ахове даўніны». |
| 1914 г.— | У г. Навагрудку—8457 жыхароў. З іх: 1609 праваслаўных, 678 католікаў, 5584 іудзеяў, 566 магаметан, 1—старазаконнік, 19—пратэстантаў. |
| 1914 г.— | У г. Навагрудку 6 вучэбных устаноў: вышэйшае пачатковае вучылішча, жаночая прагімназія, прыходскія мужчынскае і жаночае вучылішчы, народнае вучылішча, яўрэйскае вучылішча. |
| 1914 г.— | Пачатак першай сусветнай вайны. |
| 1915 г.— | З Барысаглебскай царквы вывезена цудатворная ікона Божай Маці Замкавай. |
| 1915 г., 22.09— | г. Навагрудак акупіраваны войскамі 10-й германскай арміі. |
| 1916 г.— | Пабудавана першая ў горадзе электрастанцыя. |
| 1916 г.— | Праз г. Навагрудак пракладзена вузкакалейка Любча—Наваельня. |
| 1916—1917 гг.— | Акупацыйнымі ўладамі выдавалася на нямецкай мове «Навагрудская ваенная газета». |

| | |
|---|---|
| 1918 г., 27.12— | Уступленне ў г. Навагрудак 152 стралковага палка Чырвонай Арміі. |
| 1919 г., 02.02.— | Першы з'езд Саветаў Навагрудскага павета. |
| 1919 г., 23.02.— | Мітынг і парад у гонар першай гадавіны Чырвонай Арміі. |
| 1919 г., сакавік— | З'яўленне ў ваколіцах Навагрудка польскіх узброеных атрадаў. |
| 1919 г., 18.04— | Уступленне ў Навагрудак польскіх войск: 2-гі Ковенскі пяхотны полк, 2-гі эскадрон 10-га ўланскага палка. |
| 1920 г., 19.07.— | Адыход польскіх войск і ўступленне ў г. Навагрудак Чырвонай Арміі. |
| 1920 г., 01.10.— | Паўторны ўваход у г. Навагрудак польскай арміі. |
| 1921 г.— | Адкрыццё Навагрудскага акруговага суда. |
| 1921 г.— | Прынята рашэнне аб утварэнні Навагрудскага ваяводства. |
| 1921 г., 17.03— | Пачатак дзейнасці Навагрудскай ваяводскай управы. |
| 1921—1934 гг. — | Дзейнасць у г. Навагрудку прыватнай беларускай гімназіі. |
| 1921—1939 гг.— | Дзейнасць у г. Навагрудку дзяржаўнай польскай гімназіі імя А. Міцкевіча. |
| 1921 г.— | Стварэнне і пачатак дзейнасці Таварыства Беларускай школы (ТБШ). У Навагрудскім павеце налічвалася да 50 гурткоў ТБШ. |
| 1922 г.— | У г. Навагрудку выдадзены першы нумар Беларускамоўнай газеты «Наша Бацькаўшчына». |
| 1922 г.— | Прыезд у г. Навагрудак начальніка дзяржавы Ю. Пілсудскага. |
| 1922 г.— | Другі прыезд у г. Навагрудак сына А. Міцкевіча Уладзіслава. |
| 1924 г.— | Створаны Міцкевічаўскі камітэт — добраахвотнае навуковае таварыства. |

| | |
|---|---|
| 1924—1931 гг.— | Правядзенне работ на Малым Замку па ўзвядзенню кургана ў гонар А. Міцкевіча. |
| 1924 г.— | Прыезд у г. Навагрудак прэзідэнта Польшчы Станіслава Вайцяхоўскага. |
| 1925—1927 гг.— | Дзейнасць Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады (БСРГ). У Навагрудскім павеце да 15 тыс. членаў. |
| 1926 г., 19.08— | Масавая дэманстрацыя (да 3 тыс. чал.) з патрабаваннем дэмакратычных правоў і ўз'яднання з БССР. |
| 1928 г.— | У г. Навагрудку прайшоў акруговы з'езд ТБШ. |
| 1929 г.— | Ліквідацыя ўладамі акруговай арганізацыі ТБШ. |
| 1929 г.— | прыезд у г. Навагрудак прэзідэнта Польшчы Ігнація Масціцкага. |
| 1931 г., 28.06.— | Урачыстае адкрыццё Кургана Бясмерця ў гонар Адама Міцкевіча. |
| 1931 г.— | На доме дзе жыў А. Міцкевіч устаноўлена мемарыяльная дошка. |
| 1938 г., 11.09.— | Урачыстае адкрыццё Дома-музея А. Міцкевіча. |
| 1939 г., 1.09.— | Нападзенне Германіі на Польшчу. Пачатак другой сусветнай вайны. |
| 1939 г., 18.09.— | Уваход у г. Навагрудак часцей Чырвонай Арміі. |

# Раім пачытаць:

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя.— Мн., 1993.

Архітэктура Беларусі: Энцыклапедыя.—Мн. 1993.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі:—Гродзенская вобл.—Мн., 1986.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 тт. —Мн., 1948—1987.

Гайба М. П. Навагрудак: гістарычны нарыс.—Навагрудак, 1992.

Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок.—Л., 1982.

Ермаловіч М. І. Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагародскі перыяды.—Мн., 1990.

Королёв Н. Д. Новогрудок: историко-экономический очерк.—Мн., 1988.

Краўцэвіч А. К. Гарады і замкі беларускага Панямоння.—Мн., 1991.

Ігнатовіч Ф. І. Уладзіслаў Борзабагаты.—Мн., 1993.

Навагрудскія чытанні. У 3-х кн.—Навагрудак, 1993.

Насевіч В. Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага.— Мн., 199

Тарасаў К. І. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны.—Мн., 1993.

Ткачоў М. А. Замкі Беларусі.—Мн., 1977, 198

Чаропка В. К. Імя ў летапісе.—Мн., 1994.

НУТ з 2074 т 1000 1995 г